11 (196)
лістапад

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

*Рэдакцыйная калегія:*
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

*Рэдакцыйная рада:*
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** *(старшыня рады)*, **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

Рэдакцыя:
Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Надзея Кушнер, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Мікола Волкаў — Архітэктура Старога замка ў Гродна ў XVI—XVIII стст.: выгляд і прызначэнне збудаванняў, размешчаных уздоўж нёманскай сцяны 5

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Вольга Клёцкіна — Нясвіжскі "Камедыхаўз": гісторыя аднаго будынка 23

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Святлана Талмачова — Дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцяў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада (1878–1901 гг.) 29

## ЗМЕСТ


### ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Елізараў — Пад сцягам "абвастрэння класавай барацьбы": выбарчыя кампаніі ў мясцовыя Саветы БССР у 1920-я гады — 39

### ШКОЛА МАЛАДОГА НАСТАЎНІКА

Марина Букша — Повышение мотивации учебной деятельности учащихся как один из факторов обеспечения качества знаний по истории и обществоведению 48

### МЕТОДЫКА. ТЭОРЫЯ

Аляксандр Корзюк — Гістарычныя крыніцы ў навучанні гісторыі — 55

### МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

Игнат Руденя — Быт и повседневная жизнь древних египтян *(V класс)* — 60

Алена Валіахметава, Людміла Напяркоўская — Вывучэнне тэмы "Паўстанне 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі" з выкарыстаннем апавядання Уладзіміра Караткевіча "Паром на бурнай рацэ" *(IX клас)* — 66

Таццяна Мелехава — Магілёўшчына: ад вытокаў да сучаснасці *(тыдзень гісторыі ў сельскай школе)* — 73

Содержание — 79

Summary — 80


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.
Тэлефон: 8(017) 395-79-11.
http://www.p-shkola.by;
e-mail: bhc.redaktor@tut.by.
РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".
Падпісана да друку 20.11.2015 г.
Выхад у свет 27.11.2015 г. Афсетны друк.
Фармат 60x841/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 680 асобнікаў. Зак. 1442.
*Надрукавана ў друкарні Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "БудМедыяПраект". Ліцэнзія № 02330/71 ад 23.01.2014 г. 220123, г. Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.*


***Да ведама аўтараў!***

*За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.*


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аляксандр КОРЗЮК

# ГІСТАРЫЧНЫЯ КРЫНІЦЫ Ў НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ

*Гістарычныя крыніцы выступаюць у якасці базы гістарычнага пазнання. Таму найважнейшым этапам у структуры гістарычнага даследавання з'яўляецца фарміраванне яго крыніцазнаўчай базы. Наяўнасць крыніц для гісторыка — абавязковая ўмова яго навуковага даследавання. Невыпадкова навукоўцы надаюць вялікую ўвагу праблеме крыніцы як носьбіта звестак аб мінулым, яго прыродзе і пазнавальных магчымасцях. Вывучэнне гісторыі ў сучаснай школе немагчыма ўявіць без выкарыстання разнастайных гістарычных крыніц як сродкаў навучання прадмету. Іх прымяненне ў адукацыйным працэсе спрыяе паглыбленню і канкрэтызацыі гістарычных ведаў вучняў, стварэнню каштоўнасных адносін да вывучаемага матэрыялу, фарміраванню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для паспяховага засваення гістарычных ведаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Гістарычныя крыніцы: праблема азначэння і класіфікацыі*

Па пытанні **азначэння** гістарычнай крыніцы сярод навукоўцаў няма адзінага пункту гледжання. Частка даследчыкаў, прымаючы да ўвагі вялікі ўплыў знешніх фактараў на дзейнасць чалавека (асабліва ў перыяд станаўлення чалавечага грамадства), схільная адносіць да гістарычных крыніц усё тое, адкуль запазычваецца інфармацыя аб мінулым, у тым ліку геаграфічнае асяроддзе, прыродныя бедствы, катаклізмы і г. д. Аднак названыя вышэй фактары ўяўляюць сабой найважнейшыя ўмовы дзейнасці чалавека, але не з'яўляюцца прычынамі гістарычнай падзеі. Усе яны могуць быць вывучаны метадамі іншых навук (астраноміі, геафізікі, геалогіі, медыцыны і інш.)[1].

Пераважным у азначэнні гістарычнай крыніцы ўяўляецца пункт гледжання той часткі навукоўцаў, якія вызначаюць яе як **прадукт мэтанакіраванай дзейнасці людзей.** У ёй у матэрыяльнай форме (на матэрыяльным носьбіце) рэалізаваныя пачуцці і думкі людзей, якія іх стварылі. Зыходзячы з гэтага, фактычна любы прадмет матэрыяльнай і праяву духоўнай культуры можна аднес-



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***

*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 160 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку дапаможнікаў "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (Мн., 2005), "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), "Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу на ўроках гісторыі і грамадазнаўства" (у сааўт., Мн., 2012), "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 6 классе" (Мн., 2014); "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 8 классе" (Мн., 2014), "Гістарычнае краязнаўства Беларусі" (у сааўт., Гродна, 2014); вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт., Мн., 2010).*

ці да гістарычнай крыніцы, паколькі яны нясуць на сабе адбітак той эпохі, у якой былі створаны.

Гістарычныя крыніцы ўяўляюць рэшткі культуры мінулага, аддзеленага ад нашага жыцця не толькі значным інтэрвалам часу, але і разрывам у традыцыі, што даволі часта ўскладняе іх разуменне. На іх змест значны ўплыў аказвае псіхалогія асобных сацыяльных груп, да якіх належалі іх аўтары. Менавіта таму крыніца адлюстроўвае сацыяльныя і індывідуальныя характарыстыкі іх стваральнікаў.

Велізарная колькасць і шырокія інфармацыйныя магчымасці крыніц выклікалі патрэбу ў іх сістэматызацыі і класіфікацыі. Складанасць гэтай задачы заключаецца ў тым, што крыніца ўзнікае, як правіла, у разнастайным асяроддзі. Але нават калі гэта адбываецца ў аднастайнасці, то яна часцей за ўсё адлюстроўвае не адзін, а адразу некалькі бакоў чалавечай дзейнасці. Гэта абумовіла мноства падыходаў да **класіфікацыі крыніц**.

Да нядаўняга часу ў крыніцазнаўстве існавала раздзяленне ўсіх крыніц на сем тыпаў па метадах і формах адлюстравання ў іх рэчаіснасці: пісьмовыя, рэчавыя, этнаграфічныя, вусныя, лінгвістычныя (фальклорныя), фонадакументы і кінафотадакументы. Гэтая класіфікацыя ўлічвала, з аднаго боку, найбольш агульныя рысы, характэрныя для тых ці іншых крыніц (паходжанне, змест, форма), а з другога — аб'екты даследавання асобных галін гістарычнай навукі.

Аднак такая класіфікацыя з'яўляецца даволі ўмоўнай. Асобныя яе тыпы могуць сумяшчацца. Напрыклад, этнаграфічныя, вусныя і лінгвістычныя крыніцы могуць быць прадстаўлены як у пісьмовай форме, так і ў выглядзе фонафотакрыніц. Акрамя таго, тут не вытрыманы адзіны прынцып у класіфікацыі. Адны групы вылучаныя па форме адлюстравання рэчаіснасці, іншыя — па спосабе фіксацыі інфармацыі, трэція — па аб'екце адлюстравання.

Таму больш лагічным у рамках вышэйнапісанага падыходу з'яўляецца падзел гістарычных крыніц на ***чатыры тыпы***: рэчавыя, пісьмовыя, выяўленчыя (выяўленча-графічныя і выяўленча-мастацкія), фанічныя[2].

Сярод усіх тыпаў гістарычных крыніц першаступеннае значэнне маюць ***помнікі пісьменства***. "*Там, дзе пісьмовыя крыніцы адсутнічаюць, гісторык блукае ў прыцемках*", — адзначаў вядомы савецкі даследчык М.М.Ціхаміраў[3]. З'яўленне пісьменства адкрыла шырокія магчымасці для скарачэння колькасці незафіксаванай вуснай інфармацыі. Разам з тым не варта прымяншаць значэнне іншых тыпаў крыніц. Нельга ўявіць сабе, напрыклад, даследаванне дапісьмовай першабытнай эпохі без аналізу ***рэчавых крыніц***.

Для вывучэння з'яў гістарычнага мінулага неабходна прыцягненне таксама ***выяўленчых крыніц***, якія падзяляюцца на выяўленча-графічныя і выяўленча-мастацкія. Інфармацыя, прадстаўленая ў іх змесце, выступае ў кадзіраваным, зашыфраваным выглядзе. Для яе выкарыстання неабходна правесці дэшыфроўку — аддзяленне мастацкіх метадаў і прыёмаў, уласцівых эпосе стварэння дадзенага твора, ад аб'ектыўнай інфармацыі, зафіксаванай аўтарам. Пэўныя складанасці аналізу гэтых крыніц абмяжоўваюць іх выкарыстанне ў гістарычным крыніцазнаўстве.

Апошнім часам нароўні з традыцыйным выкарыстаннем дакументальнага матэрыялу ўсё большая ўвага надаецца вусным гістарычным крыніцам. Даследчыкамі яны класіфікуюцца і называюцца па-рознаму: вуснымі, фанетычнымі, слоўнымі, фанічнымі. Пры гэтым варта ўлічваць, што вусныя крыніцы могуць быць прадстаўлены як у пісьмовай, так і аўдыёвізуальнай форме. Запісаныя на аўдыё- ці відэастужку ўспаміны аб падзеях мінулага іх відавочцаў або ўдзельнікаў уяўляюць сабой гістарычную крыніцу вуснага паходжання[4].

Такім чынам, сучасны гісторык павінен вывучаць і ўводзіць у навуковы ўжытак усе наяўныя тыпы крыніц, пашыраючы магчымасці іх інфармацыйнай аддачы. Педагогам у сваю чаргу мэтазгодна выкарыстоўваць усю разнастайнасць рэчавых, пісьмовых, вусных гістарычных крыніц.

### *Крыніцы гістарычных ведаў і сродкі навучання гісторыі*

Якім чынам у ходзе арганізацыі адукацыйнага працэсу крыніцы гістарычных ведаў суадносяцца з паняццем "сродкі навучання гісторыі"? Адказ на гэтае пытанне патрэбны перш за ўсё для палягчэння сістэматызацыі і характарыстыкі вялікай колькасці разнастайных наглядных і друкаваных дапаможнікаў, хрэстаматый, дыдактычных матэрыялаў і г. д.

Пад сродкамі навучання ў сучаснай методыцы выкладання гісторыі маецца на ўвазе ўся разнастайнасць матэрыяльных прадметаў як натуральнага паходжання, так і створаных спецыяльна для вывучэння гістарычнага мінулага ў школьных умовах[5]. Сродкі навучання прынята дзяліць на тры вялікія групы, паклаўшы ў аснову іх класіфікацыі асаблівасці ўзнаўлення ў крыніцах ведаў гістарычнай рэчаіснасці[6]. Па гэтай прыкмеце сродкі навучання гісторыі дзеляцца на:

- сродкі, якія з'яўляюцца ***першакрыніцамі гістарычных ведаў***;
- сродкі, якія ўзнаўляюць гістарычныя веды ў ***навукова апрацаваным выглядзе***;
- сродкі, якія рэканструююць гістарычную рэчаіснасць з ***дапамогай мастацтва***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Першакрыніцы гістарычных ведаў* у сваю чаргу дзеляцца на тры групы. Першую складаюць ***гістарычныя дакументы***, якія могуць быць прадстаўленыя ў пісьмовай ці друкаванай форме. Другую групу складаюць ***творы мастацтва вывучаемай эпохі*** (карціны, партрэты, скульптуры, малюнкі, карыкатуры, гравюры, кніжныя мініяцюры) і кінафотафонадакументы (фатаграфіі, кадры дакументальных кіна- і тэлефільмаў, гуказапісы і г. д.). Да трэцяй групы гістарычных дакументаў адносяцца ***рэчавыя помнікі*** вывучаемай эпохі: археалагічныя артэфакты, помнікі архітэктуры, прылады працы, зброя, прадметы дамашняга ўжытку і г. д.

Выкарыстанне ў навучанні гісторыі першакрыніц гістарычных ведаў — эфектыўны сродак фарміравання трывалых ведаў, пераканальнасці навучання, выпрацоўкі ў вучняў элементарных уменняў і навыкаў гістарычнага даследавання. Разам з тым у рэальным вучэбным працэсе іх прымяненне абмежаванае часам, адведзеным на вывучэнне гісторыі ў школе, недаступнасцю некаторых тыпаў першакрыніц для работы на ўроку (бо яны, як правіла, захоўваюцца ў музеях і архівах) і адсутнасцю ў школьнікаў спецыяльных уменняў гістарычнага даследавання. Таму першакрыніцы гістарычных ведаў, асабліва творы мастацтва і рэчавыя помнікі вывучаемай эпохі, выкарыстоўваюцца ў навучанні гісторыі несістэматычна і пераважна шляхам арганізацыі вучэбных экскурсій да гістарычных помнікаў, у гістарычныя і гісторыка-краязнаўчыя музеі, індывідуальнай навукова-даследчай працы школьнікаў.

Самую вялікую групу складаюць сродкі навучання, якія *ўзнаўляюць гістарычныя веды ў навукова апрацаваным выглядзе*. Да іх адносяцца:

- падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі, кнігі для чытання, навукова-папулярная літаратура і г. д.;
- наглядныя дапаможнікі: карты, вучэбныя табліцы, ілюстрацыі, вучэбныя карціны, схемы, дыяграмы, графікі, аб'ёмныя мадэлі і г. д.;
- электронныя падручнікі, вучэбныя камп'ютарныя праграмы, прэзентацыі, мультымедыйныя сродкі і г. д.

Сродкі навучання гэтай групы складаюць аснову арганізацыі навучання гісторыі ў школе. Яны навукова і дыдактычна апрацаваныя, спецыяльна распрацаваныя для навучання школьнікаў рознага ўзросту і адпавядаюць дасягненням сучаснай тэорыі і методыкі навучання і выхавання.

Да сродкаў навучання, якія *рэканструююць гістарычную рэчаіснасць у мастацкай форме*, адносяцца творы выяўленчага мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка), мастацкай літаратуры, кіна- і тэлефільмы, створаныя на гістарычныя сюжэты дзеячамі культуры. Іх выкарыстанне ў вучэбным працэсе дазваляе стварыць у вучняў жывыя вобразы мінулага, сфарміраваць выразныя гістарычныя ўяўленні, забяспечыць трывалае засваенне гістарычных ведаў на эмпірычным узроўні, закласці фундамент для тэарэтычнага асэнсавання гісторыі.

Зразумела, што ў некаторых выпадках прыведзенае дзяленне сродкаў навучання на асобныя групы з'яўляецца ўмоўным. Разам з тым становіцца зразумелым, што **гістарычныя крыніцы** (рэчавыя, пісьмовыя, выяўленчыя, фанічныя) **могуць выступаць у якасці сродкаў навучання** і ўваходзяць у іх *першую групу*, бо з'яўляюцца першакрыніцамі ведаў аб гісторыі грамадства. Другая выснова, якую можна зрабіць з вышэйсказанага — **усе першакрыніцы ўяўляюць сабой крыніцы гістарычных ведаў школьнікаў.**

А вось ці з'яўляюцца ўсе сродкі навучання, якія належаць да *астатніх дзвюх груп*, крыніцамі гістарычных ведаў вучняў? Безумоўна ж, не. Да іх, у прыватнасці, не адносяцца вучэбныя планы-памяткі для складання характарыстык гістарычных дзеячаў, войн, паўстанняў і г. д., схемы і табліцы, словам, усе ***дапаможныя сродкі навучання гісторыі, якія не маюць самастойнай інфармацыйнай нагрузкі***.

### *Гістарычныя крыніцы ў навучанні прадмету*

Асаблівасцю навучання гісторыі з'яўляецца тое, што вучні практычна пазбаўленыя магчымасці непасрэдна ўспрымаць падзеі і з'явы мінулых часоў і вымушаныя рэканструяваць іх на аснове розных сродкаў навучання, у якасці якіх могуць выступаць і гістарычныя крыніцы. Разгледзім іх ролю і значэнне для эфектыўнага вывучэння прадмета праз іх відавую разнастайнасць.

Так, расійскія крыніцазнаўцы А.Г.Голікаў і Т.А.Круглова вылучаюць наступныя віды ***пісьмовых гістарычных крыніц*** у адпаведнасці з двума галоўнымі, на іх думку, этапамі эвалюцыі крыніц па расійскай гісторыі ў парадку іх уваходжання ў абарачэнне[7] *(гл. табліцу 1 на с. 58)*.

У методыцы выкладання гісторыі склаліся свае падыходы да вызначэння відаў пісьмовых гістарычных крыніц, якія ў шырокім сэнсе называюцца *дакументамі*. У якасці прыкладу прывядзем класіфікацыі дакументальнага матэрыялу, прапанаваныя сучаснымі расійскімі метадыстамі М.Ц.Студзянікіным[8] і Я.Я.Вяземскім, В.Ю.Страловай[9] *(гл. табліцу 2 на с. 58)*.

Параўнальны аналіз прыведзеных класіфікацый паказвае разнастайнасць помнікаў пісьменства, якія з'яўляюцца гістарычнымі крыніцамі і могуць быць выкарыстаныя ў працэсе навучання гісторыі. У гэтым рэчышчы становіцца зразумелым, чаму прыведзеныя намі класіфікацыі гіста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 1*

**Этапы эвалюцыі відаў пісьмовых гістарычных крыніц**

| X — першая палова XIX ст. | Другая палова XIX — пачатак XXI ст. |
|---|---|
| Летапісы | Заканадаўчыя акты |
| Заканадаўчыя крыніцы | Справаводчая дакументацыя |
| Акты | Статыстычныя крыніцы |
| Справаводчая дакументацыя | Дакументы асабістага паходжання |
| Крыніцы асабістага паходжання | Перыядычны друк |
| Перыядычны друк | Палітычная карыкатура |

*Табліца 2*

**Віды гістарычных дакументаў**

| Класіфікацыя М.Ц.Студзянікіна | Класіфікацыя Я.Я.Вяземскага, В.Ю.Страловай |
|---|---|
| Актавыя дакументы | Дакументы дзяржаўнага і міждзяржаўнага характару |
| Апавядальна-апісальныя дакументы | Дакументы палітычнага (або палітыка-ідэалагічнага) характару |
| Помнікі мастацкага слова | Дакументы прыватнага характару |
| | Дакументы гістарычнага характару |
| | Дакументы літаратурнага характару |

рычных дакументаў, распрацаваныя ў методыцы навучання гісторыі, з'яўляюцца больш шырокімі. Што датычыцца рэчавых, выяўленчых і фанічных крыніц, то ў методыцы выкладання гісторыі яны традыцыйна адносяцца да *наглядных сродкаў навучання*.

У сучаснай навукова-метадычнай літаратуры адзначаецца, што ў апошні час роля нагляднасці ў адукацыйным працэсе *істотна змянілася*: з дадатковага дыдактычнага сродку яна паступова ператвараецца ў адзін з асноўных[10]. Адзначым, што сэнсавая нагрузка наглядных сродкаў навучання абумоўленая мэтамі вывучэння гісторыі, у сувязі з чым нагляднасць у засваенні вучэбнага матэрыялу служыць для ілюстрацыі яго зместу: выступае ў якасці крыніцы атрымання новых ведаў; з'яўляецца сродкам актуалізацыі і эмацыянальна-вобразнага прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу.

Няцяжка будзе заўважыць, што па асаблівасцях стварэння і характару гістарычнага вобразу выяўленчыя крыніцы можна аб'яднаць у дзве групы наглядных сродкаў навучання[11]: прадметную і ўласна выяўленчую нагляднасць.

Да прадметнай нагляднасці адносяцца *рэчавыя помнікі мінулага* — гістарычныя манументы і памятныя мясціны, прылады працы, прадметы дамашняга ўжытку, упрыгожанні, транспартныя сродкі, зброя, манеты і г. д. Як правіла, яны экспануюцца ў дзяржаўных, ведамасных або школьных гісторыка-краязнаўчых музеях і могуць быць выкарыстаныя ў адукацыйным працэсе праз правядзенне ўрокаў-экскурсій. У такой якасці могуць выступаць і *сямейныя рэліквіі* вучняў (прадметы адзення і побыту, грашовыя банкноты, ордэны і медалі і г. д.), а таксама археалагічныя знаходкі, прывезеныя з даследчых экспедыцый па родным краі і г. д.

Нягледзячы на тое, што прадметная нагляднасць мае асаблівую пазнавальную каштоўнасць, бо заснаваная на непасрэдным успрыняцці сапраўдных рэчавых помнікаў мінулага або яго матэрыяльных слядоў, яе практычнае прымяненне на ўроках гісторыі абмежаванае з-за іх месцазнаходжання, наяўнасці і стану і з'яўляецца фрагментарным. Як правіла, на ўроку рэчавыя крыніцы дэманструюцца для ілюстрацыі і канкрэтызацыі вучэбнага матэрыялу і суправаджаюцца апісаннем або тлумачэннем настаўніка. Па прычыне абмежаваных магчымасцяў іх прымянення і недахопу вучэбнага часу арганізаваць вучэбна-пазнавальную работу вучняў са сродкамі прадметнай нагляднасці як з гістарычнымі крыніцамі практычна не ўяўляецца магчымым.

Выяўленчая нагляднасць складае самую вялікую групу і займае цэнтральнае месца ў наглядным навучанні гісторыі. Яна заснаваная на навукова абгрунтаванай вобразнай рэканструкцыі мінулага ў творах жывапісу, скульптуры, вучэбных карцінах, ілюстрацыях, малюнках, фатаграфіях, карыкатурах, плакатах і г. д. Большую частку выяўленчых наглядных дапаможнікаў складаюць *гістарычныя карціны* — рэпрадукцыі твораў жывапісу, *вучэбныя карціны*, напісаныя для ілюстрацыі вучэбнага гістарычнага матэрыялу ў падручніках і вучэбных дапаможніках. Акрамя *выяўлен-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*чых гістарычных крыніц* у методыцы выкладання гісторыі да гэтай групы наглядных сродкаў навучання традыцыйна адносяць і *фанічныя* (дакументальныя і мастацкія кіна- і тэлефільмы, гуказапісы і г. д.). Такім чынам, для паспяховага навучання гісторыі настаўнік павінен ведаць асноўныя тыпы гістарычных крыніц і іх асаблівасці і ўмець выкарыстоўваць іх у якасці эфектыўных сродкаў навучання.

Сучасныя метадычныя прыёмы і прыклады арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з дакументальным матэрыялам, нагляднымі сродкамі, сродкамі выяўленчай нагляднасці, вуснымі крыніцамі, а таксама іх класіфікацыя былі разгледжаны намі ў шэрагу навуковых артыкулаў, змешчаных у "Беларускім гістарычным часопісе" ў рубрыцы "Школа маладога настаўніка"[13].

---

[1] Методология истории: учеб. пособие для студентов ВУЗов / А.Н.Нечухрин, В.Н.Сидорцов, О.М.Шутова и др. / под ред. А.Н.Алпеева и др. Мн., 1996. С. 80.

[2] Там жа. С. 86.

[3] Тихомиров М.Н. Очерки по источниковедению истории СССР феодального периода. М., 1963. С. 5.

[4] Корзюк А. Выкарыстанне вусных крыніц пры навучанні гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2014, № 12. С. 44—54.

[5] Вяземский Е.Е., Стрелова О.Ю. Теория и методика преподавания истории: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 190.

[6] Методика обучения истории в средней школе: пособие для учителей. В 2 ч. Ч. 1 / отв. ред. Ф.П.Коровкин. М., 1978. С. 67—77.

[7] Голиков А.Г., Круглова Т.А. Методика работы с историческими источниками: учеб. пособие для студ. учреждений высш. проф. образования. М., 2014. С. 3.

[8] Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в школе: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 133.

[9] Стрелова О.Ю., Вяземский Е.Е. Формы учебных занятий по истории // Настольная книга учителя истории: 5—11 классы / авт.-сост. М.Н.Чернова. М., 2006. С. 63—65.

[10] Миницкий Н. Когнитивные практики в гуманитарном образовании (междисциплинарный аспект) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2009, № 11. С. 11.

[11] Вяземский Е.Е., Стрелова О.Ю. Теория и методика преподавания истории: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. С. 191; Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. Мн., 2009. С. 190.

[12] Корзюк А. Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу ў працэсе навучання гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2012, № 8. С. 44—49; Ён жа. Метадычная падрыхтоўка настаўніка да выкарыстання наглядных сродкаў у навучанні гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2012, № 9. С. 36—44; Ён жа. Выкарыстанне сродкаў выяўленчай нагляднасці на ўроках гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2014, № 3. С. 47—58; Ён жа. Выкарыстанне вусных крыніц пры навучанні гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2014, № 12. С. 44—54; Корзюк А.А., Дзямідава Н.А. Канструяванне зместу этапаў урока: выкарыстанне магчымасцей гістарычнага дакумента // Гісторыя і грамадазнаўства. 2014, № 11. С. 36—47.

---

*Сёлета ў № 6 "Беларускага гістарычнага часопіса" ў рубрыцы "Школа маладога настаўніка" чытачам была прапанаваная серыя метадычных распрацовак урокаў студэнтаў 3 курса гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка: Івана Пугача "Использование предметной наглядности при изучении культуры цивилизаций Древнего Востока и Америки" (с. 49—56), Мікіты Пугачова "Использование памятников древнекитайской литературы при изучении темы "Общество и культура Древнего Китая" (с. 54—56), Дзмітрыя Пятрова "Установление межпредметных связей при изучении темы "Культура Древнего Рима" (с. 57—59).*

*Метадычныя матэрыялы былі распрацаваныя на семінарскіх занятках па методыцы выкладання гісторыі і апрабіраваныя падчас педагагічнай практыкі пры выкладанні гісторыі Старажытнага свету. І.Пугач прапаноўвае варыянты выкарыстання прадметнай нагляднасці і іншых дыдактычных сродкаў пры вывучэнні такой адметнай з'явы культуры чалавека, як пісьменства, па тэмах "Культура старажытных егіпцян", "Культура і рэлігія народаў Міжрэчча", "Грамадства і культура Старажытнага Кітая", "Цывілізацыя альмекаў" вучэбнага курса "Гісторыя Старажытнага свету". М.Пугачоў падзяліўся вопытам выкарыстання твораў старажытнакітайскай літаратуры — баек і казак, а таксама павучэнняў кітайскага філосафа Канфуцыя падчас вывучэння культуры Старажытнага Кітая. Дз.Пятроў на прыкладзе твору Гарацыя "Помнік" прапаноўвае прасачыць і ацаніць, як спадчына Старажытнага Рыма паўплывала на творчасць рускага паэта Аляксандра Пушкіна і класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча.*

*Рэдакцыя часопіса працягвае публікаваць лепшыя метадычныя распрацоўкі ўрокаў па гісторыі студэнтаў гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка, апрабіраваныя падчас заняткаў па методыцы выкладання гісторыі і педагагічнай практыкі. У гэтым нумары прапаноўваем матэрыял студэнта 5 курса Ігната Рудэні, у якім удала спалучаюцца разнастайныя прыёмы выкарыстання пісьмовых і выяўленчых гістарычных крыніц у ходзе вывучэння тэмы "Побыт і паўсядзённае жыццё старажытных егіпцян" па сусветнай гісторыі ў 5 класе.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ